# *Ліпень 1944 г.*

**Адамчук Міхал, Мацьковічы:**

Калі набліжаўся фронт, немцы забралі мяне коней даглядаць. Трэба было авёс касіць, збрую і ружжо чысціць. Узялі мяне і коней маладых каваць. Немец на калене каваў, конь нагу забраў і ён па калене ўдарыўся. Я быццам засмяяўся, ён на мяне замахнуўся, але я ўхіліўся. Калі падкавалі коней, паклікаў мяне немец, выняў кавалак старой засоленай саланіны, даў па кілішку. Паехалі мы з нямецкімі коньмі далей. Мост каля Анусіна звалены быў, спыніліся сырадэлю касіць. Ад Чартаева мінамёты б’юць, процьма нямецкага войска. Пагналі нас у Драгічын, але і там Каўпак мост спаліў. Заехалі ў лес, сушымся, канюшыну косім. Я хачу ўцякаць, але ўласавец нам, мясцовым, пашпарты пазабіраў. Кажу яму:

— Тут багатыя вёскі, у вёску трэба ехаць.

Ён паехаў, а куртка з дакументамі асталася. Мы за тыя дакументы і каб раз’ехацца. Адзін у Мілкавічах знаёмых меў, паехаў. І я тудысюды; да аднаго гаспадара, якога сын у Германіі быў, прашу, каб сказаў, што я ў яго працую. Але сярод немцаў пазнаняк быў, пазнаў, што я ўцякаю. Уляцелі ўхату ўласаўцы, усё пабілі. Я прыкінуўся хворай гаспадыняй, яны не правяралі і пабеглі далей. Гаспадар схаваў мяне ўпадвал, я паспаў, пабег у Мілкавічы. Бачу: шасцярых бяжыць пад плютам і пытаюць пра немцаў. Дагналі, пастралялі, сарвалі боты і да мяне:

— Давайте поллитра за фрицовы ботинки!

Бальшавікоў людзі кавай пачаставалі, а мяне адпусцілі. Сказалі:

— Женитесь и нас на свадьбу призывайте!

Я вяртаўся. У Сямятычах поўна немцаў абголеных ляжала.

**Бобер Рыгор, Міклашы:**

Пры немцах, з красавіка 1942 да ліпеня 1944 года, працаваў я ў паравозным дэпо ў Беластоку машыністам пасажырскіх цягнікоў. Жыў я тады з жонкай і дачкой па вул. Сасновай, 81. Праца на чыгунцы была да часу, калі расіяне не збамбардзіравалі станцыю і горад. Было гэта пад канец чэрвеня 1944 г. Машыністы больш-менш ведалі, дзе зна-

ходзіцца лінія фронту і на два тыдні перад прыходам фронту ўдалося мне адаслаць жонку з дачкою ў Міклашы. Машыністу давалі тады 170, а памочніку — 150 марак і па 200 грамаў ялавічыны ў дзень. Падчас бамбардзіроўкі быў я ў Беластоку і бачыў, як снарад папаў у суседаву хату.

У палове ліпеня і я апынуўся ў Міклашах. Да Бельска даехаў я цягніком, а далей дабіраўся пешшу. Тут у Міклашах ужо тыдзень стаяла нямецкае войска, а ў Орлі — у садзе каля кафлярні і на могілках — ды на калёніі Антонава былі ўжо саветы. Людзі хаваліся па зямлянках. Немцы і саветы ведалі пра сябе, але не арыентаваліся аб баявой сіле ворага. Акурат майму брату ўцёк у сад конь. Брат баяўся пайсці за ім, але братавая, Насця Бобер, рашылася злавіць каня. Узяла яна аброць і пайшла ў сад. Там патаемна гутарыла з рускім і расказала яму пра сітуацыю ў вёсцы. Здалёк бачыў гэта немец і калі братавая вярнулася з канём, стаў яе распытваць пра рускіх. Немцы раззлаваліся і сталі зганяць усіх жыхароў вёскі на панадворак Чарняўскіх. Відаць, намерваліся расстраляць нас. Адзін немец гаварыў па-польску і жанчыны пачалі яго прасіць выратаваць нявінных людзей, тлумачылі, што сяляне давалі немцам малако, харчы. Неўзабаве людзей адпусцілі ў зямлянкі. Мабыць, выратавала нас і тое, што свайго часу некаторыя сяляне супрацоўнічалі з немцамі.

26 ліпеня 1944 года вечарам руская разведка падышла да рэчкі і з гучным „ураааа!” прагнала немцаў з браневікамі ў галадоўскі лес. З гэтага часу 26 ліпеня лічыцца ў Міклашах святам. Удзячныя Богу за выратаванне вяскоўцы даюць у гэты дзень на абедню. Моляцца пераважна пажылыя людзі, бо маладыя не разумеюць гэтага свята, пакольні яны самі не перажылі жахаў вайны.

**Казбярук Мікалай, Старыя Кухмы:**

Перад фронтам мы ў Кухмы пераехалі, бо ў Зарэчанах, недалёка чыгункі, небяспечна было. І жончыных пляменнікаў забралі з сабою. Цесць коніка даў і мы жалезняком прыехалі.

Немцы, як адступалі, Юшкаў Груд і Новую Волю спалілі. А савецкія тылавікі коней забралі. Мы воз у картофельную яму закапалі, а рускія адкапалі, драўляныя буксы паабрэзвалі і кінулі. Праслы паламалі, каня з хлява забралі і ў Случанцы за літр гарэлкі прадалі. А там швагер каня пазнаў і мы яго вярнулі.

**Казлоўскі Антон, Калодна:**

23 ліпеня нашу вёску занялі рускія. Я прасмыкаўся вуліцай, выйшаў салдат і загадаў мне схавацца за сцяной. Вечарэла, узнікла перастрэлка, а пасля ўсё заціхла. А рана з узгоркаў сталі байцы сходзіць, зараз сапёры сталі ладзіць разбураны мост, амерыканскія машыны цягнулі тэхніку.

Мы ў Засадах хаваліся, але нас рускія асцераглі, што там ваенная пазіцыя, і мы ў Боркі перабраліся. Спалілі маёнткі ў Разаліне і ў Каралёвым Мосце, а вёсак не палілі. Зноў рускія буданы па лесе паставілі; і раненыя, і абдзертыя, і неабмытыя яны былі. Мы думалі, што зноў савецкая ўлада, як да вайны, тут будзе, але нам байцы сказалі, што будзем пад Польшчай.

**Кананчук Вера, Трасцянка:**

Саветы наступалі пяшком, і немцы пяшком адступалі. Саветаў мы частавалі, знаеце, свае людзі; „Здрастуйце, таварышы”, гаварылі. Аднаго рускага ў ямках немцы застрэлілі, ляжаў ранены; „Идите отсюда, бо и вас проклятый немец убъёт”, гаварыў. Пахавалі яго на могілках, шкада было. А адзін старшы, можа палкоўнік, то браў Насцю за ручку і гаварыў „Пойдём в кино”. Фільмы на клуні высвятлялі вечарам, крэслы былі, сядзелі і аглядалі. Да гэтага часу ніхто ў нас чагось такога не бачыў. Толькі, да выезду ў бежанства яшчэ, да аднаго суседа быў брат прыехаў, быў нейкім старшым. Грамафон з сабою прывёз. А мы, малыя, чуем, што нешта іграе; цікавіць нас, што гэта такое. А мацеры нашы гавораць: „Нэ ідіэтэ туды, то чарты там співают”.

**Кандратовіч Сяргей, Вялікія Азяраны:**

Калі немцы адступалі, ім шапкі скідалі і „Дзеньдобры” гаварылі. А яны адказвалі:

— Дзеньдобры і давідзэня: рускія сюды прыдуць.

У 1944 годзе немцы акопы капалі, а рускія некалькі дзён абстрэльвалі. Нашы людзі ў свіраны хаваліся. Пажару ў вёсцы не было. Забілі семярых немцаў; чатырох завезлі на нашы могілкі, а траіх на панадворку нейкім пахавалі і цяпер яны там ляжаць, бо невядома дзе закапаны.

Калі немцы ў 1941 годзе гналі рускіх, дык нашых коней у Бераставіцу змабілізавалі і тыя коні прапалі. А рускія коней не забіралі, хіба што каго раненага завезці. Ды і людзі коней на багнах хавалі.

У 1944 годзе рускія нашых у армію забіралі: ад васемнаццаці да пяцідзесяці гадоў узросту. І трэба было падпісацца, што добраахвотнікамі ідуць. Нікога ўжо не вывозілі, толькі на фронт бралі.

**餐Каролька Канстанцін, Старое Ляўкова:**
У Ляўкове немцы трымаліся доўгі час. Як адыходзілі, забралі нашу кабылу, што пад Ахрымамі хадзіла. Я пайшоў да таго, што разам пілі і ён прывёў мне кабылу назад. Бо немцы розныя былі: калі вывозілі людзей у Беласток, то былі такія, што ледзь не плакалі.

Немцы ўцяклі хутка і мо на другі-трэці дзень з'явіліся рускія. Праз Ляўкова танкі ішлі, у канцы вёскі, дзе сёння кладка, пераправуляліся цераз раку ў бок Ахрымоў аж дзернякі з-пад гусеніц ляцелі. Пасля гразлі ў балоце, выцягалі іх канатамі, канаты рваліся, але пайшлі наперад. Мост у Капітаншчыну слабы быў, то рускія салдаты клёцы на плечах насілі, каб танкі маглі пайсці. Баёў каля Ляўкова не было.

**Касцюк Уладзімір, Козлікі:**
Калі набліжаўся фронт, цесць, што ў Рыбалах жыў, схаваўся з коньмі ў лес. Немцы яго і яшчэ некаторых рыбалаўцаў, што таксама прыхаваліся, загналі ў Трычоўку і ў стадоле замкнулі. Сказалі ўсім напісаць пісьмы да сем'яў, што едуць у Германію. Аднаго старога выпусцілі, каб тыя пісьмы ў вёску занёс. Мо і вывезлі б іх, але не ўспелі; саветы раптоўна наступілі і яны вечарам толькі спалілі стадолу з людзьмі. А раніцай прыйшлі саветы...

Немцы стаялі ў Козліках, а саветы з Алексіч кацюшамі ўдарылі па іх. І некалькі стадол у нашай вёсцы згарэла, але ўсе хаты асталіся цэлыя.

Прыходу рускіх людзі вельмі абрадаваліся: спявалі, танцавалі. І не дзіва: немцы, бывала, ехалі дарогай, заязджалі на панадворак, забіралі парсюка і не плацілі; а нам самым нельга было біць.

Пасля вайны сталі хадзіць кажушнікі, рабавалі. Рускага палкоўніка з Рыбалаў у Заблудаве забілі, і юнака аднаго дзевятнаццацігадовага. А пасля з Бельска прыехалі, злавілі таго што забіў і ў Заблудаве публічна павесілі. І тады ўсё абціхла, перасталі хадзіць.

**Корх Ян, Краскаўшчына:**
Калі гналі немцаў, леткам 1944 года вёску наведаў нейкі савецкі генерал, які вячэраў і начаваў у нашай хаце. Ён спытаў мяне, чаму я не пайшоў у партызаны. Адказаў я яму: „Товарищ генерал, здесь не было настоящей партизанки, а одни грабители..."

На гэтым размова закончылася, аднак савецкі генерал палюбіў мяне і накіраваў працаваць на чыгунку. Трэба ведаць, што тады ўся чыгунка была пад савецкай ваеннай адміністрацыяй і таму яшчэ ў 1944 годзе я перайшоў у дарожную службу. Пасля, вызваліўшыся з войска, працаваў стрэлачнікам, манеўровым і тэлеграфістам, а закончыўшы пачатковую школу і розныя курсы стаў дзяжурным руху на чыгунцы.

**Лук'янюк Мікалай, Бялкі:**

Вызваліла нас Чырвоная Армія 23 ліпеня 1944 года, у дзень святога Антонія. Тады ўсе сказалі, што гэты дзень будзем святкаваць (але ўжо пра тое забыліся). Адразу пасля вызвалення многіх з фурамі забралі ўабоз, каб вазілі раненых салдат аж пад Сураж.

Потым прыехалі да нас савецкія агенты (так іх звалі) і намаўлялі ўсіх праваслаўных выязджаць у Савецкі Саюз. Былі гэта нейкія Валя, Віктар ды Патапенка. З нашае вёскі намовілі 18 сем'яў. Некаторыя, хоць запісаліся, не выехалі. Тыя сем'і вывозілі восенню і зімой 1944 года.

**Масальскі Канстанцін, Фальваркі-Тыльвіцкія:**

Пад канец нямецкай акупацыі прыехаў з Беластока да нас у вёску пан Эдвард з жонкай і масквіч Барыс (інжынер), з жонкай Нінай (лекарам). Прыехалі, бо ў адну ноч савецкія самалёты скінулі лістоўкі, у якіх заклікалі пакінуць горад перад бамбёжкай. Так у сапраўднасці і было, бо ў адну ноч авіяцыя падвесіла над Беластокам свяцільныя ракеты, якія дазвалялі дакладна бамбардзіраваць цэлі. Я чуў, што бомбы падалі на аэрадром Крыўляны, чыгуначныя вакзалы, казармы і іншыя ваенныя цэлі.

З таго перыяду да сёння асталася мне памятка на далоні. Мама папрасіла, каб я дапамог жаць авёс сярпом. Гэтую работу мама выконвала вельмі хутка і добра, а я зрабіў сабе вялікую рану на далоні. Мама скінула свой кафтан і перавязала крывавячую маю далоню ды забрала мяне дахаты. Дома заліла рану самагонкай, а затым абкрунула кужальным палатном. Больш я сярпа ў рукі не браў.

Адступаючыя немцы сарганізавалі лінію абароны ўздоўж нашых і суседскіх будынкаў ды ў недалёкіх кустах, дзе было шмат акопаў. Салдат, які трымаў абарону ў нашых збудаваннях, жэстыкуліруючы і гаворачы на ламанай рускай мове, загадаў бацьку вывесці са стадолы воз, загрузіць яго хатнім дабром і адвесці трыццаць метраў ад будынкаў, каб не згарэў у выпадку пажару стадолы. Калі бацька стаў капаць між будынкамі яму для сховішча сям'і, немец прыйшоў, забраў лапату і загадаў схавацца ў яме ад бульбы ў адлегласці каля 150 метраў ад збудаванняў; сховішча між будынкамі было б небяспечнае ў выпадку

артылерыйскага абстрэлу. Ён таксама загадаў, каб бацька не выходзіў з ямы, бо маглі б яго забраць да капання акопаў. Жэстыкуліруючы і размаўляючы з бацькам, ён паказваў на нас, дзяцей — значыць і ў яго былі дзеці ў нашым узросце. З усяго таго, што ён гаварыў, я зразумеў толькі часта паўтараемую фразу „Hitler kaputt!” Бацька тлумачыў нам, што снарады, якія пралятталі над намі, былі няшкодныя, бо выдавалі свіст — знак таго, што паляцяць далёка. Калі ж снарад выдае нязборны, хрыплы і цяжкі гук, тады абазначае гэта, што ўпадзе блізка; тады трэба маланкава ўпасці на зямлю. Пасля двух дзён, ноччу, немцы адступілі ў напрамку Беластока. Яшчэ сёння бачу агонь і дым палаючых збудаванняў, перашкаджаючыя наглядаць поле бою.

**Насковіч Рыгор, Кляшчэлі:**

У 1944 годзе, у час адступлення немцаў, „тыгры” пад Кляшчэлі з напрамку Чаромхі і Боцькаў падышлі. Прыляцелі рускія самалёты і пачалі бамбіць танкі, а гэтыя пачалі абстрэльваць Кляшчэлі. Узнік пажар. Шмат будынкаў згарэла. Двух мясцовых сялян — Грышку Цыбуліна і Мікалая Насковіча немцы ўзялі ў заложнікі. Пасля некалькіх месяцаў заложнікі вярнуліся дамоў.

**Нікалаюк Кузьма, Піліпкі:**

Праход фронту выглядаў у нас трагічна; мо з тыдзень ішлі баі. За вёскаю мо з чатыры гектары жыта стаяла сцяною і немцы ў тым жыце заселі. А рускім рэчка перашкаджала, і як яны з-за рэчкі ўвойдуць у вёску, тады немцы высунуцца з жыта і пераб’юць ды выганяць іх. Такое наступленне мо тры разы паўтаралася. Мы ў вёсцы былі, але ў апошні дзень не выседзелі і ў Слівова за Кленікамі ўцяклі. А ў час баёў на нашым панадворку танк нямецкі стаяў. На нашым прыгуменні лясок рос. І той танк высунецца, урэжа па трашчоцкай хваіне, адкуль рускія наступалі, і схаваецца.

Наш бацька быў цвіком ці зубілам вырысаваў на вушаку „Госпадзі памілуй” і наверсе прыбіў. Немцы ў нас кухню паставілі, хадзілі, сядзелі або пер’е з курэй дзерлі і той напіс бачылі. І зразумелі, што не камуніст тут жыве. А немцы ўсялякія былі і ўсіх, апрача нас, спалілі, а ў нас нават дабытак астаўся. Я лічу, што нас тое і ўратавала, бо бацька яшчэ і кучу ікон вынес і за плотам наклаў.

Немцы былі ў мундзірах, а рускія ў гімнасцёрках; былі і такія ўзброеныя рускія, што і басанож ішлі ззаду.

**Нядзельская Зінаідая, Орля:**

Другі раз рускія прыйшлі таксама неспадзявана. Немцы хутка адступілі, калі з боку Гайнаўкі пачаўся савецкі абстрэл. Уцяклі яны за рэчку Арлянку і падаліся дарогай на Тапчыкалы, на Бельск. Маіх двух родных братоў, Качаноўскіх, невядома па якой прычыне немцы забілі. Пахавалі іх у Шчытах. Маці ад жалю захварэла на галаву — бегала на могілкі і разгортвала магілу... Ужо ў мірны час паставілі мы ім помнік.

**Панфілюк Мікалай, Дубічы-Царкоўныя:**

Легкадумнасць ніколі да дабра не давядзе, а яшчэ горш, калі яна ад гарэлкі мае пачатак — тады фініш адзін: смерць; і ў мірны час, і ў ваенны. Расказваюць, што леткам 1944 года, калі саветы гналі немцаў на захад, у Дубічы-Царкоўныя прыехала на конях савецкая разведка, некалькі байцоў. Прыехалі з напрамку Вітава, хаця іх часць стаяла ў Арэшкаве. Па дарозе распытвалі людзей, у тым ліку і майго дзядзьку Ваньку, ці ў Дубічах выпадкова няма немцаў. Адказ быў адзін: Няма! — бо так было ў сапраўднасці. Байцы былі ўжо падвыпіўшыя і давай у нашым канцы вёскі шукаць самагонкі. Майго суседа Івана Нікіцюка нават моцна напалохалі, бо адзін разведчык прыклаў пісталет да яго грудзей і з матам запатрабаваў, каб той даў яму гарэлкі. Сусед яе не меў, але баец нейк з бядою ад яго адчапіўся. Усё ж такі байцы на сваю бяду напіліся. У той час, калі яны пілі самагонку, у вёску па-за клунямі ўвайшла нямецкая франтавая часць. Нашы людзі зараз паведамілі байцоў, каб яны ўцякалі або хаваліся куды, бо ж на вуліцы стаялі іхнія коні з сёдламі і толькі дурань не сцяміў бы, чые гэта коні. Аднак адзін п’яны разведчык сказаў:

— А что там немцы? Ведь я возле Орешкова положил двадцать фрицов!

І давай з аўтаматаў страляць да немцаў. А тыя, вядома, не спалохаліся іх і ведалі, як з такімі распраўіцца, і да іх. Байцы бачаць: бяда! і давай уцякаць на сваіх конях. Адзін з іх, які быў вельмі падобны да нашага вяскоўца, які ў той час быў на прымусовых работах у Германіі, уцякаў напрасткі на Жарывец і яму ўдалося ўцячы. А другому, які выехаў на выган і дарогу ў Істок, не пашчасцілілася. І дзіўна гэта, бо ад’ехаў ён ад вёскі нейкіх 800 метраў і на Андрыянавай гары, на якой сёння расце пасаджаны мною лес, спасцігглі яго нямецкія кулі. Людзі бачылі, што адзін немец паставіў свой ручны кулямёт на слуп плота,

прыцэліўся і даў чаргу па ўцекачу. Той ужо быў блізка старога лесу за гарой... На той гары нашы людзі яго і пахавалі. Тую магілу я помню, але хутка, бадай у 1949 годзе, была праведзена эксгумацыя ўсіх савецкіх магіл, таксама і косці згаданага разведчыка перапахавалі на ваенныя могілкі ў Гайнаўцы.

А варта было дурэць і паказваць сваё геройства ў п'яным відзе? Думаю, што не, бо адступаючыя немцы спакойна далей пайшлі б на захад. Але каб каторы з іх загінуў з рук разведчыкаў, тады вёску магла б спасцігнуць трагедыя, бо на вайне жартаў няма. І бравура, гэта найгоршы дарадчык!

**Патэюк Антон, Карыціскі:**

У 1944 г. правялі ў нас мабілізацыю ў Савецкую Армію, але праз тры тыдні сказалі, што мы — грамадзяне Польшчы — і адпусцілі нас дадому. Я вяртаўся з-пад Баранавіч да сябе пяшком ды падводамі. Граніцу, якую паставілі пасля вайны, усе называлі „керзонка". Ці мы маглі мець нейкі ўплыў на тое, якім чынам праходзіла мяжа? Канешне, не. Усё вырашалі без нас. У адной вёсцы клуні засталіся на савецкім баку, а хаты — на польскім. Кажуць, што лінія Керзона ішла проста, але калі ў Сталіна запыталі, як яна павінна праходзіць, ён паклаў сваю файку і сказаў: „Вось так". Таму ад пушчы мяжа адхіляецца на захад і выглядае як файка.

**Перавой Юлія, Наройкі:**

Калі наступалі саветы, наша вёска не пацярпела. Але Сківы-Вялікія спалілі, бо нехта з забітага немца паліто сцягнуў.

Калі праходзіў фронт, я вярталася ад татавага брата, што ў Макарках жыў. Спынілі мяне немцы, я ім сказала, што малых дзяцей маю і адпусцілі мяне. Іду далей. Перастрэлка такая ўспыхнула, што мне пясок ад куляў у вочы сыпаўся. Зноў напаролася я на нямецкі самаход. Дапытваюць мяне, што я раблю пад перастрэлкай. Забралі мяне ў той самаход і завезлі да дзядзька ў Стаднікі, там яны сваю канцылярыю мелі. Праверылі, ці я ім праўду гаварыла; мабыць падазравалі, што я варожай разведкай займаюся. Трымалі мяне тры дні, цукеркі і пернікі мне давалі. Не адпускалі, шкада дзяўчыны, гаварылі, бо фронт, хай сядзіць у дзядзькі. Пасля звольнілі, але асцерагалі перад мінамі.

**Петышук Мікалай, Хлевішчы:**

Была другая палова ліпеня 1944 года. Далёка на ўсходзе адчуваліся водгукі, быццам грымела, хоць неба было чыстае. Пад абед прыехаў на

ровары солтыс нашае вёскі (солтыс меў права мець ровар, бо рэшце гаспадароў жандармерыя ровары пазабірала) і загадаў нашаму бацьку даць каня, каб адвезці жандармерыю — ёсць такі загад. Ехаць мае возам у двое коней (Міхаль таксама дасць каня). Як немцы ўцяклі, Міхаль вярнуўся, але конь прапаў.

Пад вечар пачуліся ўзрывы, такія, што шыбы з вокнаў павыпадалі. Гэта ўзрывалі дэпо, будынак станцыі і вадакачку на станцыі Чаромха.

На другі дзень прыйшлі савецкія салдаты, а ў вёсцы пачалася страляніна. У нас за клуняю паставілі чатыры мінамёты, а гэтым усім камандаваў маёр; памятаю, як трымаў ён у далоні трубку тэлефона. Адзін салдат сядзеў у клуні, расхіліўшы салому ў шчыце іназіраў цераз бінокль і падаваў каардынаты мінамётчыкам, куды маюць страляць. Памятаю, як маёр крычаў у трубку: „Дуб, всеми силами помагай Берёзе!” а потым сказаў: „Хозяин, забирай ребятишек, уходите — здесь может быть плохо!”

Тата загадаў: „Танька, адзявай дзяцей!” Мама дала нам штонікі і куртачкі, а мы давай хутка ўсё тое апранаць. Наша сястрычка Валя, якой было два годзікі, сядзела на ложку і сваімі блакітнымі вочкамі паглядала то на нас, як мы адзяваемся, то на маму, і дзівілася, чаму не апранаюць яе. Валечка хацела заўсёды быць з намі і рабіць усё, як мы, яе старэйшыя браты.

У той час бацька расклаў плахту, паклаў у яе плед, загарнуў у ручнічок кавалак хлеба і сала, зрабіў клунак, закінуў яго на спіну і загадаў: „Пайшлі, дзеткі!” Нас было, як я ўспомніў, пецярых хлопчыкаў. Не выйшлі мы яшчэ з падворка, як якіхсьці 200 метраў ад нашае сядзібы разарваўся снарад. Мы хутка пабеглі ў лес, у які ад нашага хлява было нейкіх трыццаць метраў. Забралі мы з сабою дзве каровы, жарабя, тата зняў з плота конаўку і кубак, і так пабрылі мы зараслямі ў сасновы лес — у Таяўкі. За ім была вёска Вулька-Тэрахоўская. Але мы не пайшлі ў гэту вёску, а падаліся ў лес Буркі, а ім дайшлі ў лес Тычыя. Там бацька зрабіў з галля шалаш. Там мы прасядзелі ўсю ноч, а раніцай пайшлі ў вёску Апака, да добрага бацькавага знаёмага, гаспадара Шыдлоўскага. У гэту вёску ўсё прыбывалі людзі з Хлевішчаў, якім удалося ўцячы з лініі фронту. І прыносілі яны ўсё больш трагічныя весткі, што загінула шмат людзей і папалена многа дамоў.

Прыехаў і Мікалай Богач. Са слязамі на вачах расказваў, як у яго прысутнасці забілі яго жонку і двое малых дзяцей. Людзей прыбывала ўсё больш, а вёска Апака — невялікая. Кожны меў сваю сям’ю, цяжка было пракарміць столькі народу. Мама даіла нашых кароў, якіх я раніцай выганяў на апацкую пашу, і карміла малечаў малаком, таксама

і свае сяброўкі Нюркі з Хлевішчаў, якая мела малое дзіця. Тая Нюрка была добрай краўчыхай, перарабляла рэчы для дзяцей... Малым дзеткам малака ставала, нам, старэйшым — не. Тата даведаўся, што наша сядзіба цэлая, і на світанні дабіраўся да хаты, прыносіў нам хлеба і сала, накарміўшы цялушачку, якая засталася адна ў нашым хляве. Пасля, пагаварыўшы з мамай, узяў мяне са старэйшым братам на наш хутар, і мы тую цялушачку зарэзалі. Прынеслі мяса ў Апаку. Мама стала варыць суп на мясе, і мы былі ўжо сытыя.

Фронт стаяў на месцы. Людзі ўжо думалі, што гэтаму мучэнню не будзе канца. Урэшце немцы адступілі. Васіль, які быў таксама з намі ў Апацы, сказаў: „Адступілі, бо рускія падцягнулі і зайгралі на „Кацюшах”!”

І так мы, пабыўшы ў Апацы дзён восем, вярнуліся дадому. Будынкі былі ў парадку, найгорш — не было каня і не было чым звозіць з поля збожжа. Як находзіў дождж — дык каня ў суседа не дастанеш: кожны хацеў перад дажджом звезці сваё ў клуню...

Людзі стараліся забыцца пра гора. Моладзь вечарамі збіралася ў кампанію, спявала. Вельмі часта гучалі песні „На позицию девушка провожала бойца”, „Всё васильки, васильки — много их выросло в поле” і іншыя. Пачалося нармальнае жыццё. Дзяўчаты вабілі сваімі галасамі кавалераў, а яны шукалі сабе сяброўку жыцця...

**Пташынскі Павел, Старое Ляўкова:**

Пабыў я дома да часу, аж саветы немца гналі. Мяне змабілізавалі ў Свіслач, парваныя немцам пуці ладзіць. Як стала граніца, то нас перавезлі цераз граніцу і пусцілі. Каб не тая граніца, то і не вярнуліся б, бо тых, што з намі былі, забралі на фронт і там яны пагінулі.

Пабыў тут мо з два тыдні і на камісію мяне пазываюць. Саветы мяне раней прызналі нестраявым, а палякі — у лінейныя. Але як устанавілі ў нас граніцу, то ў Семяноўцы паўстала застава. Я запісаўся туды на працу і мяне ўжо палякі на вайну не бралі. А адзін мой равеснік на фронце тады загінуў.

**Раманюк Мікалай, Чаромха:**

Было гэта ў ліпені 1944 года. Нямецкая механізаваная часць прарвалася з Высокага ў напрамку Кляшчэль — меркавалі прабіцца праз Беласток ва Усходнюю Прусію. Паколькі іх маршрут перасеклі ўжо савецкія войскі, запыніліся яны каля Чаромхі-Вёскі. Насупраць нашага дома, дзе дарога ў Чаромху-Станцыю пралягае праз адвадную канаву, стаў „Тыгр” і з гарматы страляў у напрамку Дабрывады. Баючыся, што снарад можа трапіць і ў наш дом, мы збеглі ў непрыкметнае схо-

вішча, што было выкапана ў малінніку нашага агарода, а рэчы вынеслі і склалі каля плота. Калі мы высоўваліся паглядзець абставіны, немец, які з навушнікамі стаяў на танку, крычаў нам:

— Kamerad, zurьck! Iwan dum-dum! (Хавайцеся, бо рускія страляюць!)

Ноччу пачулі крык: „Бросайсь на танк!” Раздаўся гарматны выстрал. Раніцай убачылі салдата з адарванаю нагой. Другі ляжаў забіты з асколкам у галаве. Трэці схаваўся ў Дубковічавай хаце на процілеглым баку дарогі. Ранены прасіў вады:

— Хозяин, дай попить. Когда они уйдут? — пытаў.

— Не знаю, — адказваў бацька.

— Они сегодня должны уйти, — шаптаў баец.

Пасля абеду немцы сапраўды пачалі збірацца ў дарогу. Спалілі стадолу, дзе была аўтамабільная майстэрня. „Тыгр” наехаў на плот, знішчыў нашы рэчы: кухонную пасуду, кросны, калаўротак ды іншыя. Калі накіраваўся на наша сховішча, тады бацька, Лявон Раманюк, выскачыў і раскінуўшы рукі загаласіў:

— Камрат, кляйнэ! (Таварыш, дзеці!)

— Ja, ja — кіўнуў галавою немец, ды так павярнуў танк, што маліны паклаліся. Убачыўшы раненага, закрычаў:

— Halt! Iwan!

Спыніўшы машыну падышлі да салдата.

— Пан, дай покушать, — папрасіў ранены.

— Kamerad, komm! — паклікаў бацьку немец, — Russe — essen. (Рускі хоча есці.)

Калі пачуў, што нічога не маем, загадаў пашукаць жанчын. У Дубковічаў далі лусту хлеба і кубак малака. Раздаўся выстрал — немец застрэліў раненага. Калі бацька вярнуўся, дык злыдзень з усмешкай сказаў:

— Kamerad, zurьck! Iwan dum-dum. (Вяртайся, рускі застрэліўся.)

Немцы ад’ехалі. Пецярых забітых рускіх салдат пахавалі ў брацкай магіле на пляцы, дзе цяпер жыве Лявон Карпюк. Пазней, пасля эксгумацыі, перавезлі іх на могілкі ў Мілейчычы.

Тыдзень пасля крывавай расправы з’явіліся рускія, траіх іх было. Разглянуліся па панадворку. Калі ўбачылі бацьку, адзін з іх спытаў:

— Ты хозяин?

— Я.

— Мы тебе лошадку привели, но какой-то мужик взял. Но мы тебе другую приведём.

Незнаёмы папрасіў малака. Збоку падышоў іншы салдат і кінуўшы некалькі слоў падаўся на дарогу. Наступаў вечар, змяркала...

— Стой! Кто идёт? Руки вверх! — пачулася з дарогі.
Нешта загрукатала.
— Вы свои?
Стала ціха, а зараз пачулася плясканне ў далоні а затым выстрал...
— Russen, Banditen!
Салдаты скрыліся ў агарод. Раніцай убачылі забітага байца; куля трапіла ў шлем, у пяціканцовую зорку. Раструшчыла чэрап, адно мазгі разбрызгаліся. Салдата тут жа пахавалі.
Мінула некалькі чарговых дзён. Калі з намі былі салдаты, з-пад царквы пракацілася брычка з ездаком; на павозцы сядзеў немец у афіцэрскай уніформе.
— Чаму не стралялі? — спытаў бацька байцоў.
— Ещё поймаем, — адказалі.
З боку Чаромхі-Станцыі пачуліся ўзрывы. Неўзабаве ўбачылі немца, які ехаў адтуль на брычцы. Адзін баец застаўся ў агародзе, а другі засеў у дупле спарахнелай вярбы на Дубковічавым панадворку. Немец павярнуў у бок царквы, адкуль раней прыехаў. Пусціў за сабою чаргу з аўтамата па дарозе, якая вяла ў Кляшчэлі. Калі зраўняўся з вярбою, раздаўся выстрал, пасля другі. Немец зваліўся на брычку, затым упаў і конь. Салдат паклікаў мяне і кажа:
— Смотри, пацан, поймали фрица...
А бацьку сказаў:
— Иди, хозяин! Бери шоколад и одеяла.
Салдаты пайшлі, а за імі з'явілася многа рускага войска. Нямецкага капітана (чарамшане кажуць, што немцаў было двох) пахавалі каля дарогі. Мне вядомае месца ягонага спачынку. Бацька тлумачыў, што той немец ездзіў узрываць вадакачку на станцыі.
Калі пасля вайны хацелі адкапаць астанкі нямецкага афіцэра, дык не трапілі на людскі шкілет, толькі выкапалі конскі чэрап. Мне ўсё-ткі вядома, што астанкі немца ляжаць у тым жа месцы, дзе яго ўпершыню пахавалі.

**Рыдз Кірыла, Шарні:**
На Ілью 1944 года немцаў ужо не было. Прыйшлі два рускія афіцэры, адзін пытае мяне:
— Может яички есть?
— Нет.
— Иди сюда!
Іду, а ён паказвае, што курыца сядзіць, а пад ёй восем яек.
— Слушай, — кажа мне зноў, — имеешь с пол литра?

— Есть.

Яны прынеслі цыбулю, сядзімо, выпіваем. Я зацікавіўся Паўлюсам і спытаў пра яго.

— Почему спрашиваешь? — пытаюць.

Я адказаў, што падчас вайны са шведамі цар Пётр спярша прайграваў, а пасля стаў выйграваць і захапіў у палон многа шведскіх генералаў. Сабраў іх і ўзняў тост за ваенных настаўнікаў.

— А хто яны такія? — спытаў адзін палонны.

— Гэта вы, спадары, — адказаў цар.

— Так, вот и генерал живёт по генеральски, — адказалі мне афіцэры.

**Свіцкі Яўген, Ячна:**

У 1944 годзе рускія дайшлі да Гродна. На станцыі ў Бялянах за Новым Дваром склад з палівам збамбілі. У нас немцы ганялі мужчын акопы капаць, у гліне. 20 ліпеня 1944 года немцы пазрывалі масты і тут на рэчцы абарону зрабілі. Як пад Ліпскам два рускія танкі прайшлі, то немцы змыліся, але пасля вярнуліся. 22 ліпеня падышлі рускія. Тры снарады ў царкву далі і ў некалькі хат.

Я тады з татам у Грабянях быў. І мама ў Грабянях была, але ў іншым месцы, а дзед з бабай у Ячне. Немцы знайшлі закапанае мяса, тата прывёз, зварылі; трымалі ў каморы, а я адрэзваў і ў склеп насіў.

Падалі, што рускія перайшлі рэчку і немцы паўцякалі. Зараз паявілася руская разведка. Апоўдні 23 ліпеня рускія ўляцелі на панадворак. Адзін на вішню залез.

— Тебя снимут! — асцерагалі яго.

— Если не здесь, то в другом месте; такая наша жизнь.

Адзін убачыў немца, які не страляў, то і ён не стараляў да яго, але іншага немца, раненага, дабіў. Прыйшлі ў склеп.

— Немцев нет?

— Нет.

— Табак имеете?

Было сем папяросаў, а байцоў семдзесят. Пакуль яны тыя папяросы скурылі, дык немцы адступілі з бугарка.

26 ліпеня Грабяні былі занятыя, а Ячна яшчэ не. Ячна немцы падпалілі, каб дымную заслону паставіць; і дзедка мой тады згарэў.

27 ліпеня вярталіся мы дахаты. Тата збанок малака кіслага нёс. Рускія з жыта павылазілі і тым малаком дзяліліся. А нам столькі тушонак далі, што мы з татам ледзь прынеслі.

Немцаў саветы аж пад Карповічы адкінулі, але ў Аўгустаў не ўвайшлі. І рускія нас зноў сталі на акопы ганяць — бяссільны ў моцнага заўсёды вінаваты.

**Сідарук Уладзімір, Кузава:**

Пяты годзік пайшоў мне, калі ў Кузаве ў час фронту кватаравалася савецкае войска. У стадоле Мікалая Саўчука (які непадалёк царквы жыў) спыніўся ўзвод танкістаў. Яны кожнай раніцы са спевам ішлі ў непадалёкі лес на вучэнні. Прыкмеціў я іх аднойчы. Калі я стаяў пры дарозе разявіўшы рот і прыглядаўся вайскоўцам, нечакана падышоў да мяне камандзір, які ішоў збоку і сказаў: „Пойдём, мальчик, с нами” і, узяўшы мяне за руку, павёў за сабою.

Кусочак дарогі падышлі мы лесам, а калі спыніліся перад агароджай з калючага дроту, камандзір сказаў: „Здесь обождёшь меня. Будем обратно возвращаться, заберём домой”.

Цэлы дзень прасядзеў я на траве пры дарозе. Прыглядаўся то на вартаўніка з карабінам, то зноў на салдат занятых вучэннем.

Пасля захаду сонца мае знаёмыя вярталіся дамоў і камандзір забраў мяне да сябе на кватэру. Там уручыў мне некалькі банак тушонкі, трохі кускавога цукру і шакалад. Калі я вяртаўся дахаты загружаны ласункамі, сустрэў сваю бабульку, якая шукала мяне па вёсцы, палічыўшы мяне загінуўшым. Радасці не было канца: бабулі — ад знойдзенай „згубы”, а мне — ад смакавітых ласункаў.

Мае паходы працягваліся да таго часу, пакуль не пачалася сутычка з немцамі, якія з Брэста прабіваліся ў напрамку Беластока. У бітве той загінула многа рускіх танкістаў. Яны пасля гэтага здарэння пакінулі нашу вёску.

**Тарасевіч Міхал, Гайнаўка:**

Калі немцы сталі адступаць перад надыходзячым фронтам, мы рашылі прыхавацца ў Белавежскую пушчу. Помню, як увечар паклалі мы на фурманку пасцель і іншыя рэчы ды выехалі. У той час па чыгунцы ішоў паравоз з адным вагонам і рваў мост. Быў вялікі гук, які яшчэ сёння стаіць у маіх вушах.

Сядзелі мы на ўскраіне пушчы тры дні. Аднойчы раніцай адна жанчына зарэзала курыцу і зварыла суп. Мы сядзелі кружком і елі той суп, калі ў міску трапіў асколак ад міны; на шчасце нікому з нас нічога не сталася. Мы ўцяклі далей у пушчу, на паляну ў Кузьмін лес і там прасядзелі чарговых некалькі дзён. Наведалі нас партызаны, прасілі

есці, і сказалі нам ад'ехаць яшчэ глыбей, бо мела быць вялікая перастрэлка. Заехалі мы ў 15-ы квартал і сталі пад вялікімі дубамі. Ноччу пайшоў праліўны дождж і каб ад яго прыхавацца нашы парабілі буды з яловага лубу. З сабою мелі мы карову і каня.

Далёка было чуваць выстралы гармат. Каля нас салдаты пракладалі правады і сказалі нам, што можна будзе вяртацца дадому, калі яны тыя правады знімуць. Праз два дні мы выехалі з лесу; я ехаў разам з дзядзькам і цёткай. Нейкіх трыста метраў перад Семяноўкай на дарозе ляжала мёртвая жанчына. У дзядзькавай хаце ляжаў труп савецкага салдата, а на стале была разабрана вінтоўка; відаць чысціў ён ружжо, калі за хатай узарваўся снарад і асколак забіў яго. У нашай хаціне на падлозе ляжала салома, відаць, спалі на ёй салдаты, а на дне ў сагане асталося крыху маннай кашы; я тады ўпершыню паспрабаваў яе.

Калі фронт аддаліўся мы рашылі вяртацца ў Пасекі. Усё трэба было будаваць ад пачатку; у 1945-46 гадах была г.зв. свабода і за карыстанне лесам ніхто не караў.

**Трахімчук Уладзімір, Дзернякова:**

Як рускія наступалі, немцы адступалі. На рэчцы Супрасль, якая круг робіць вакол Міхалова і Гарадка, немцы паставілі абарону. На скрыжаванні дарог акопы выкапалі, а каля нас рушнікарня нямецкая была. За намі стаялі гарматы і білі ў Гарадок, а меншыя бліжэй Гарадка.

Немец нам чужую карову далучыў. Мы тры дні бегалі, каб яе не згубіць. Немец клікаў нас: „Komm!" і шакалад нам даваў, суп. Мы паямо, а тая карова ўцякае то туды, то сюды, а мы бегаем. На чацвёрты дзень яе не выгналі. То ён нам палкаю ўліў, а мы як зайцы скакалі.

Яшчэ перад фронтам амаль усе ў лес паўцякалі, толькі жанчыны з малымі дзецьмі асталіся; два тыдні ў лесе сядзелі. Немцы школу замініравалі і загадалі ўсім у школу на сход сысціся. А некаторыя бачылі, як міны закладалі. І людзі не пайшлі ў школу, толькі ў лес; і так перажылі.

Фронт спярша ў Баброўніках пастаяў, пасля ў Вераб'ях і ў Гарадку. У Случанцы вялікі бой быў, палова вёскі згарэла. 22 ліпеня да нас прыйшла руская разведка і паведаміла, што можам вяртацца — фрыца прагналі. І ўсе фурманкі адправілі ў Беласток ехаць, адбіраць раненых і ў палявы шпіталь вазіць.